

## Яўген Васьковіч

Яўген Васьковіч нарадзіўся ў Бабруйску 26 лютага 1990 году ў сям'і рабочых. Пасьля школы вучыўся завочна на журналісцкім аддзяленьні філялягічнага факультэту Магілёўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Куляшова. Працаваў у газэце "Бобруйский курьер".

Яго затрымалі 17 студзеня ў Магілёве на наступны дзень пасьля яго ўдзелу ў акцыі салідарнасьці зь беларускімі палітвязьнямі.

У траўні 2011 году Яўген Васьковіч быў асуджаны разам з Арцёмам Пракапенкам і Паўлам Сырамолатавым на 7 гадоў пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму за спробу падпалу ў ноч на 17 кастрычніка 2010 году будынку Бабруйскага КДБ, у які былі кінутыя бутэлькі з запальнай сумесьсю.

Яўгена Васьковіча, Арцёма Пракапенку і Паўла Сырамолатава судзілі па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу — "Злоснае хуліганства" і "Наўмыснае прычыненьне шкоды ў асабліва буйных памерах". Адвакаты, у сваю чаргу, заўважылі, што іх падабаронныя давалі паказаньні пад ціскам і зьбіраліся не спаліць будынак, а толькі яго пашкодзіць. На думку абароны, довады абвінаваўцы грунтуюцца толькі на ўяўленьні таго, што магло б здарыцца, тады як рэальная шкода ад дзеяньняў маладых людзей складае 253 тыс. рублёў (56,2 даляра), якія ўжо выплачаныя.

Прысуд быў вынесены 18 траўня 2011 г. судом Бабруйскага раёна і г.Бабруйску да 7 гадоў пазбаўленьня волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

Адрас:
ПК № 15
Слаўгарадская шаша, 183,
г. Магілёў,
212013



## Арцём Пракапенка

Арцём Пракапенка родам з Гародні. Нарадзіўся 27 ліпеня 1990 году. Пасьля сканчэньня школы вучыўся ў Бабруйску. Не хаваў сваёй прыхільнасьці да анархісцкага руху.

Арцёма Пракапенку, Яўгена Васьковіча і Паўла Сырамолатава судзілі па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу – “Злоснае хуліганства” і “Наўмыснае прычыненьне шкоды ў асабліва буйных памерах”.

Адвакаты адзначалі, што іх падабаронныя давалі паказаньні пад ціскам і зьбіраліся не спаліць будынак, а толькі яго пашкодзіць. На думку абароны, довады абвінаваўцы грунтуюцца толькі на ўяўленьні таго, што магло б здарыцца, тады як рэальная шкода ад дзеяньняў маладых людзей складае 253 тыс. рублёў (56,2 даляра), якія ўжо выплачаныя.

Акрамя таго, заявілі адвакаты, Беларускае тэлебачаньне неправамерна выкарыстала відэазапісы папярэдняга сьледзтва аб нападзе падсудных на будынак КДБ для свайго фільму. Маладых людзей там паказалі як асобаў, што не маюць уласных жыцьцёвых перакананьняў, якія гатовыя зьнішчыць усё, што толькі бачаць.

Асуджаны 18 траўня 2011 г. судом Бабруйскага раёна і г.Бабруйску ч.2 арт.339 КК (злоснае хуліганства) і ч.3 арт.218 КК (пашкоджаньне маёмасьці ў асабліва буйным памеры) да 7 гадоў пазбаўленьня волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Знаходзіцца ў калёніі №15 у Магілёве.

Адрас:
ПК № 15
Слаўгарадская шаша, 183,
г. Магілёў,
212013

## Мікола Статкевіч



Нарадзіўся 12 жніўня 1956 году ў вёсцы Лядна Слуцкага раёну ў сям'і настаўнікаў. Скончыў Менскае вышэйшае інжынэрнае зенітна-ракетнае вучылішча па спэцыяльнасьці "вайсковы інжынэр па радыёэлектроніцы". У 2009 годзе кангрэсам "Эўрапейскай кааліцыі" вылучаны кандыдатам у прэзыдэнты на выбарах 2010 году.

19 сьнежня 2010 г. браў удзел у акцыі на плошчах Кастрычніцкай і Незалежнасьці. Пасьля жорсткага разгону мітынгу пры ад'езьдзе на таксоўцы быў заблакаваны спэцназам і затрыманы.

Зь 19 сьнежня 2010 г. па 12 студзеня 2011 г. трымаў галадоўку пратэсту ў СІЗА КДБ.

26 траўня 2011 г. у Ленінскім судзе г. Менску судзьдзя Людміла Грачова агучыла ягоны прысуд: 6 гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму (пракурор — Кірыл Чубкавец).

Спачатку адбываў тэрмін пакараньня ў калёніі г. Шклову, дзе атрымаў траўму рукі, працуючы на лесапілцы. Адміністрацыя калёніі, аднак, замоўчвала гэты факт і адмаўляла сваякам у спатканьнях. Міколе Статкевічу тады было адмоўлена ў тэлефанаваньнях дадому, таксама аказваўся іншы маральны ціск.

12 студзеня 2012 году на закрытым паседжаньні Шклоўскі раённы суд асудзіў Статкевіча да больш строгага рэжыму ўтрыманьня — 3 гады зьняволеньня ў крытай турме (судзьдзя — Віталь Волкаў). Прычынай было названае "злоснае парушэньне рэжыму". Ужо праз 4 дні стала вядома аб знаходжаньні палітыка ў турме № 4 г. Магілёву, дзе нашмат больш жорсткія ўмовы ўтрыманьня.

Адрас:
турма №4
вул. Крупскай, 99а
г. Магілёў,
212011



## Ігар Аліневіч

Нарадзіўся 24 верасьня 1983 году. Пасьля сярэдняй школы скончыў унівэрсытэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Са школьных гадоў цікавіўся гісторыяй, асабліва анархісцкага руху, чытаў працы і вывучаў жыцьцё ягоных заснавальнікаў, тэарэтыкаў і практыкаў: Бакуніна, Крапоткіна, Нестара Махно ды іншых.
Затрыманы сілавікамі ў цывільным 28 лістапада ў 2010 году ў Маскве, Ігар Аліневіч быў вывезены імі ў невядомым накірунку, і толькі праз суткі стала вядома пра яго знаходжаньне ў СІЗА КДБ у Менску.

27 траўня 2011 году суд Заводзкага раёну Менску пакараў Ігара 8 гадамі пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Ён быў абвінавачаны паводле часткі 2 артыкулу 339 КК РБ (хуліганства, здзейсьненае групай асобаў) і частак 2 і 3 артыкулу 218 КК (пашкоджаньне маёмасьці агульнанебясьпечным спосабам і ў асабліва буйным памеры).

Праваабарончыя арганізацыі адзначаюць, што суд над Ігарам Аліневічам і іншымі фігурантамі справы адбываўся з шэрагам парушэньняў, і таму зьняволеных па гэтай справе нельга лічыць законна асуджанымі. Так, затрыманьне Ігара Аліневіча ў Маскве і далейшая перавозка яго ў СІЗА КДБ у Менск адбываліся з парушэньнем устаноўленых працэдураў, у тым ліку працэдуры экстрадыцыі беларускіх грамадзянаў з Расейскай Фэдэрацыі. Пры затрыманьні ён быў пазбаўлены магчымасьці атрымаць дапамогу з боку адваката і, такім чынам, магчымасьці абскардзіць затрыманьне. Цягам папярэдняга сьледзтва да абвінавачаных ужываліся псыхалягічны ціск і катаваньні. Падчас судовага разьбіральніцтва не выконваўся прынцып роўнасьці бакоў датычна прадстаўленьня доказаў.

Падчас знаходжаньня ў СІЗА КДБ разам зь іншымі вязьнямі Ігар зазнаў катаваньні (пра што апісана ў яго турэмнай кнізе “Еду ў Магадан”). Перад тым, як яго перавялі ў СІЗА па вул. Валадарскага ў Менску маладому чалавеку прапаноўвалі працаваць на ўлады ў якасьці хакера, ад чаго той катэгарычна адмовіўся.

Адрас:
ПК № 3
п. Віцьба
Віцебскі р-н, Віцебская вобл.
211300



## Мікалай Дзядок

Мікалай Дзядок нарадзіўся 23 жніўня 1988 году ў г. Брагіне на Гомельшчыне. Пасьля школы скончыў юрыдычны каледж БДУ. Працаваў у калектарскай фірме. На момант арышту быў студэнтам 2-га курсу завочнага аддзяленьня праграмы “Паліталёгія і эўрапейскія дасьледаваньні” Эўрапейскага гуманітарнага ўніверсытэту. Пасьля затрыманьня ў верасьні 2010 году Мікалая трымалі ў ізалятары па 3 дні, а пасьля “перазатрымлівалі” па новых справах: аб хуліганстве, нават крадзяжы — але абвінавачаньне не прад’яўлялі да кастрычніка.

24 верасьня 2010 г., фактычна адбыўшы больш за 20 сутак пад арыштам, Мікалай Дзядок быў абвінавачаны ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі каля Генштабу Беларусі, і 1 кастрычніка яму было прад’яўленае абвінавачаньне па артыкуле 339 ч. 2 — “хуліганства”.

27 траўня 2011 г. у Заводзкім судзе гораду Менску судзьдзя Жанна Хвайніцкая вынесла Мікалаю прысуд — 4,5 гады пазбаўленьня волі (г.зв “справа анархістаў”). Да гэтага моманту Мікалай Дзядок ужо больш за 8 месяцаў знаходзіўся пад арыштам

У канцы траўня 2012 г. паводле рашэньня начальніка Шклоўскай калёніі № 7 Мікалай Дзядок быў пераведзены ў памяшканьне камэрнага тыпу, так званы “БУР” (“адзіночку”), на паўгода. Да гэтага яго неаднаразова прымушалі пісаць прашэньні аб памілаваньні. Мікалай таксама пазбаўлены доўгатэрміновага спатканьня з маці і жонкай, якое раней было дазволенае ў чэрвені. За час знаходжаньня ў Бабруйскай і Шклоўскай калёніях Мікалай атрымаў больш за 10 спагнаньняў за розныя надуманыя парушэньні, кшталту “няправільна адрэагаваў на заўвагу”, і ня змог трапіць пад амністыю. 4 сьнежня 2012 г. стала вядома, што адмысловая камісыя калёніі прыняла рашэньне аб пераводзе Мікалая Дзядка ў крытую турму. Прычынай абвешчаныя шматлікія спагнаньні за парушэньне дысцыпліны, якіх палітвязьню прад’яўлена ажно 22. У лістападзе 2014 года, за 3 месяцы да сканчэньня тэрміну, на Мікалая Дзядка завялі новую крымінальную справу за “парушэньне рэжыму адбыцьця пакараньня”, яго чакае працяг тэрміну зьняволеньня.

Адрас:
турма №4
вул. Крупскай, 99а
г. Магілёў,
212011

## Ариф Юнус



Юнусов Ариф Сейфулла оглу - руководитель департамента конфликтологии и миграции Института мира и демократии Азербайджана, кандидат исторических наук, политолог-конфликтолог, историк.

Родился 12 января 1955 года в Баку, окончил исторический факультет Бакинского государственного университета.

28 апреля 2014 года Ариф Юнус вместе с супругой Лейлой Юнус прибыли в аэропорт Баку для вылета в Париж для участия в международном мероприятии, где были задержаны правоохранительными органами Азербайджана. С места задержания А.Юнус был госпитализирован в предынсультном состоянии в реанимационное отделение городского клинического центра №1 Баку. Лейла Юнус была доставлена в Следственное управление по тяжким преступлениям Генеральной прокуратуры Азербайджана. Также был проведен обыск на квартире Юнус и в офисе Института мира и демократии.

30 июля Арифу Юнусу были предъявлены обвинения по статьям 274 (измена родине) и 178.3.2 (мошенничество с причинением крупного ущерба).

5 августа 2014 года Ариф Юнус был задержан сотрудниками полиции и доставлен в Следственное управление по тяжким преступлениям Генпрокуратуры Азербайджана. 7 августа был переведен из СИЗО пенитенциарной службы в СИЗО министерства национальной безопасности (МНБ).

29 октября Насиминский районный суд Баку по представлению Генпрокуратуры Азербайджана продлил срок ареста Арифу Юнусу еще на 4 месяца - до 5 марта 2015 года. Защита выдвинула ходатайство о замене этой меры пресечения на домашний арест. 30 октября ходатайство об освобождении Арифа Юнуса под домашний арест было отклонено.

**Адрес:**

AZ1096, Azerbaijan, Baku, Kamil Balakishiyev street, h. 35, f. 32 (Халид Багирову для Арифа Юнус).



## Расул Джафаров

Расул Джафаров - азербайджанский правозащитник, общественный активист. Со 2 августа 2014 года находится под арестом.

В 2006 году Расул Джафаров закончил Западный университет в городе Баку по специальности "Международное право". После окончания вуза занимался защитой прав людей из социально уязвимых слоев азербайджанского общества.

Был основателем и председателем созданной 10 декабря 2010 года НПО "Клуб прав человека" (КПЧ) и тщетно добивался ее регистрации.

Уголовному преследованию Джафарова предшествовали проверки деятельности Клуба прав человека, проведенные специалистами Минфина и Минналогов Азербайджана, а также экспертами Совета государственной поддержки НПО.

В июле 2014 года Джафарову был запрещен выезд из Азербайджана, его банковские счета были арестованы. 31 июля правозащитник был допрошен в качестве свидетеля по делу в отношении ряда неправительственных организаций, а в его квартире проведен обыск.

2 августа 2014 года Джафаров был задержан. Решением суда Джафаров был заключен под стражу на три месяца. Ему предъявили обвинения по статьям 192 (незаконное предпринимательство), 213 (уклонение от уплаты налогов) и 308 (злоупотребление должностными полномочиями) УК Азербайджана.

23 октября срок ареста Джафарова был продлен на три месяца.

В августе 2014 года международная правозащитная организация Amnesty International признала Расула Джафарова "узником совести".

В октябре 2014 года находящийся под арестом Расул Джафаров был номинирован на международную правозащитную премию Human Rights Tulip.

**Адрес:**

AZ1100, Azerbaijan, Baku, 39 Zardabi avenue, apt 40 (для Расула Джафарова).



# Лейла Юнус

Лейла Ислам гызы Юнус (Юнусова) - азербайджанская правозащитница.

Родилась 21 декабря 1955 года в г.Баку. Окончила исторический факультет Бакинского государственного университета.

В 1995 году основала НКО "Институт мира и демократии" (ИМД), занимающийся вопросами прав человека, исследования и содействия урегулированию конфликтам.

28 апреля 2014 года азербайджанские силовики задержали Лейлу Юнус и ее супруга политолога Арифа Юнуса. Лейла Юнус в течение девяти часов допрашивалась в Генпрокуратуре Азербайджана в качестве свидетеля по делу журналиста Рауфа Миркадырова, подозреваемого в государственной измене. После допроса Лейла Юнус была отпущена. Силовики провели обыск в офисе ИМД и на квартире правозащитницы.

30 июля Лейла Юнус была задержана в Баку. Ей были предъявлены тяжкие обвинения по статьям 274 (государственная измена), 178.3.2 (мошенничество в крупном размере), 192.2.2 (незаконное предпринимательство), 213.2.2 (уклонение  от уплаты налогов), 320.1 и 320.2 (фальсификации документов). Суд принял решение об аресте правозащитницы.

4 августа 2014 года адвокат Лейлы Юнус Джавад Джавадлы сообщил об ухудшении состояния ее здоровья, в связи с острой формой сахарного диабета. 24 сентября пять адвокатов Лейлы Юнус заявили о ее избиении в СИЗО сотрудником этого учреждения.

7 октября 2014 года было проведено голосование, по итогам которого Лейла Юнус была названа одной из основных претендентов  на премию «За свободу мысли» имени Андрея Сахарова в 2014 года.

24 октября Насиминский райсуд Баку продлил срок содержания под стражей Лейлы Юнус, оставив ее под арестом до 28 февраля 2015 года.

**Адрес:**

AZ1096, Azerbaijan, Baku, Kamil Balakishiyev street, h. 35, f. 32 (Халид Багирову для Лейлы Юнус).